# **Музей у чамадане “А ці ведаеш ты…?”**

**Мэта:** садзейнічаць грамадзянска-патрыятычнаму выхаванню вучняў, спрыяць фарміраванню павагі да мінулага свайго народа,цікавасці да яго гісторыі.

Рэквізіт: чамадан, чыгун, прас, збан, ступа з мялам.

Ход экскурсіі

Дарагія сябры, добры дзень!

Мы прыйшлі да вас з чароўным чамаданам, у якім ляжаць рэчы ўжо старыя, але вельмі цікавыя. Што гэта за рэчы і для чаго яны патрэбны, мы вам і раскажам.

Мы вам загадкі, а вы нам адгадкі! Усё вельмі проста! Пачынаем!

1. В печи стоит, закрытый крышкой…

Огонь ласкает твёрдый бок.

Печь освещает пламя вспышкой.

Щи варит в печке (чугунок).

**Чыгун** – посуд для прыгатавання ежы. Чаму ён так называецца? (Вырабляўся з чыгуну). Унутры, як правіла, глазураваўся, але часта быў і неглазураваны. Гатаваліся ў ім розныя стравы: і супы, і кашы, запяканкі. У вялікіх чыгунах варылі свінням бульбу. Кожная гаспадыня мела спецыяльны чыгун, у якім варыла луг – настойку з попелу, якую выкарыстоўвалі для мыцця галавы, таму што шампуняў яшчэ не прыдумалі. А яшчэ ў гэтым чыгуне парылі бялізну.

2. Не бык, а бодает,
Не ест, а еду хватает,
Что схватит – отдаёт,
А сам в угол идёт (ухват – рагач)

**Рагач** – прылада, з дапамогай якой ставілі ў печ і даставалі адтуль чыгуны. Іх выраблялі з жалеза. Рагач мае адтуліну, у якую ўстаўлялі гладка адгабляваны яловы чаранок. Чаму яловы, а не бярозавы ці ліпавы? (У елкі густа размешчаны галінкі, таму яна не выгінаецца.)

3. Был я копан,
Был я топтан,
Был я на пожаре,
Был я на кружале.

Сто голов кормил (кувшин –збан)

**Збан** – посуд для захоўвання малака, квасу. Вырабляўся з розных відаў гліны, часцей за ўсё з чырвонай. Мог быць глазураваны і ўнутры, і звонку. Часцей выкарыстоўваўся для сквашвання малака. Чаму? (Гліна добра трымае цяпло, а для сквашвання патрэбна цяпло).

4. Как у Бабы у Яги
Нет совсем одной ноги,
Зато есть замечательный
Аппарат летательный (ступа)

**Ступа з мялам** – прылада для размолу прыправаў, зерня на крупы. Вялікія драўляныя ступы выкарыстоўваліся для атрымання круп. У малых металічных ступках здрабнялі перац, каляндру. Чаму для атрымання круп выкарыстоўваліся драўляныя ступы, а для прыправаў металічныя? (Для круп не патрэбна моцна церці зерне, а прыправы трэба размалоць. Дрэва мякчэйшае за метал і магло раструшчыцца).

5. В полотняной стране,

По реке простыне,

Плывёт пароход,

То назад, то вперёд,

А за ним такая гладь,

Ни морщинки не видать (утюг-прас)

**Прас (утюг)** – прылада для прасавання адзення. Выраблялася з чыгуну. Унутр праса засыпаліся чырвоныя вугельчыкі, яны і награвалі падэшву праса. Адзенне шылася з натуральных тканін, таму не было страху, што яно расплавіцца ад гарачага праса. Як вы думаеце, у які час дня гаспадыня прасавала адзенне і чаму? (Раніцай. Пасля таго, як выпаліцца печ. Печ палілі толькі раніцай).

6. Маленький, горбатенький
Всё поле пробежал
И весь хлеб повалял (серп)

**Серп** – ручная прылада працы для зжынання збожжа і травы. Выкарыстоўваецца і цяпер. Вырабляецца з металу. Ручка заўсёды драўляная. Серп заўсёды паўкруглай формы. Чаму? (Для большага захопу збожжа або травы для зжынання).